View metadata, citation and similar papers at core.ac.uk
brought to you by CORE
provided by Belarusian State Pedagogical University Repository

# БАГДАНОВІЧ І.І. ЗНАЧЭННЕ "КАРОТКАЙ ГІСТОРЫІ БЕЛАРУСІ" В. ЛАСТОЎСКАГА Ў СТАНАЎЛЕННІ ГІСТАРЫЧНАЙ АДУКАЦЫІ Ў БЕЛАРУСІ

Зб. Палітычныя, сацыяльна-эканамічныя і этнакультурныя працэсы на тэрыторыі Беларусі ў XIX – пач XXст.: Да 150-годдзя скасавання прыгоннага права ў Расійскай імперыі: матэрэялы Рэсп. навук.-тэарэт.канф., г. Мінск, 4 сак.2011г./ Бел.дзярж.пед.ун-т імя М.Танка; рэдкал. А.І.Андарала, В.В. Бушчык і інш. – Мінск: БДПУ, 2011. С. 327-330.

**Ключавыя словы**: Ластоўскі В., Кароткая гісторыя Беларусі, беларускі народ, аб'ект гісторыі, перыядызацыя гісторыі, гістарычнае значэнне.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Выхад у свет у 1910 годзе ў Вільні "Кароткай гісторыі Беларусі", аўтарам якой быў Вацлаў Ластоўскі (Власт) стаў унікальнай для тагачаснай Беларусі падзеяй, значэнне якой і сёння нельга недаацэньваць. У чым вартасць гэтай кнігі? Чаму яна зноў і зноў звяртае на сябе ўвагу навукоўцаў – даследчыкаў айчыннай гістарыяграфіі і методыкі выкладання гісторыі. Перш за ўсё таму, што яе аўтар – чалавек з неардынарным і трагічным лёсам, дзейнасць якога, як пры жыцці так і пасля смерці, прыцягвала да сябе ўвагу і атрымлівала разнастайныя, часам супрацьлеглыя, ацэнкі грамадскасці. Справа ў тым, што ён быў не толькі гісторыкам, але і пісьменнікам, грамадскім і палітычным дзеячам, які стаяў ля вытокаў беларускага нацыянальна-культурнага адраджэння пачатку XX ст. і ў многім вызначаў яго ідэйныя асновы і практычныя дзеянні.

Вацлаў Юсцінавіч нарадзіўся 20 кастрычніка 1883г. у Дзісненскім павеце Віленскай губерні (зараз Міёрскі раён Віцебскай вобласці) ў сям'і дробных арандатараў. Грамаце навучыўся дома, затым скончыў народную школу ў Пагосце. У школе вучыўся паспяхова, вызначаўся грунтоўнымі і глыбокімі ведамі. З дзяцінства шмат чытаў, займаўся самаадукацыяй, спрабаваў атрымаць вышэйшую адукацыю. У 1904-1905гг., калі жыў і працаваў у Пецярбурзе, "зайцам" наведваў лекцыі на гістарычным факультэце ўніверсітэта. Затым, калі пераехаў у Рыгу, паспрабаваў экстэрнам здаць экзамены на атэстат аб сярэдняй адукацыі. Паспяхова здаўшы амаль

усе іспыты, ён “праваліўся” на экзамене па рускай мове. Новых спроб да атрымання адукацыі ён больш не рабіў, бо на гэта ўжо не заставалася ні вольнага часу ні магчымасцей.

У 1902г. В. Ластоўскі ўступіў ў ППС, якая дзейнічала ў Літве, а ў 1906г. перайшоў у БСГ, у складзе якой, паводле ўласнаручна напісанай аўтабіяграфіі, заставаўся да 1908г. З 1909г. па 1914г. ён працаваў у Вільні сакратаром рэдакцыі газеты “Наша Ніва”. З 1915г. цверда заняў незалежніцкія пазіцыі, г.зн. пачаў адкрыта выказвацца за незалежнасць Беларусі і ад Расіі і ад Польшчы. У 1916-1917гг. стаў рэдактарам газеты “Гоман”, якая выдавалася на акупіраванай немцамі тэрыторыі. У пачатку 1918г. ён стварыў у Вільні арганізацыю “Сувязь незалежнасці і непадзельнасці Беларусі”, якая выпрацавала галоўныя напрамкі стварэння незалежнай Беларусі.

В. Ластоўскі робіць усё магчымае, каб дабіцца незалежнасці Беларусі, рашуча выступае супраць якіх-небудзь спроб утварыць беларускую дзяржаву разам з Польшчай ці Літвой. Верагодна таму 18 сакавіка 1918г. ён разам з іншымі прадстаўнікамі Віленскай Беларускай Рады быў кааптаваны ў склад Рады БНР у Мінску. 23 сакавіка 1918г. ён прыехаў з Вільні ў Мінск і ўдзельнічаў у пасяджэнні Рады БНР  25 сакавіка 1918г., дзе была прынятая трэцяя Устаўная грамата, якая абвяшчала незалежнасць Беларускай Народнай Рэспублікі.

Ён разам з іншымі беларускімі сацыялістамі не падпісаў вядомую тэлеграму ад 25 красавіка на імя германскага імператара Вільгельма II, у якой буржуазныя дзеячы БНР дзякавалі імператару за вызваленне Беларусі ад бальшавікоў. Адначасова В. Ластоўскі не бачыў перспектыў для незалежнай Беларусі ў супрацоўніцтве з бальшавікамі, якія разагналі Усебеларускі з’езд у Мінску і пачалі рэпрэсіі ў дачыненні да кіраўніцтва з’езда і да дзеячаў беларускага нацыянальнага руху. Менавіта гэтыя дзеянні сфарміравалі ў яго ўстойлівыя антысавецкія настроі і недавер да бальшавікоў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

В. Ластоўскі непрыхільна аднёсся да стварэння 1 студзеня 1919г. ССРБ, а праз два месяцы і ЛітБел ССР, на тэрыторыі гэтых рэспублік не было ні беларускага друку, ні беларускіх школ. Асабліва балюча ён успрыняў тое, што ў хуткім часе пасля абвяшчэння Беларуская ССР адным росчыркам пяра бальшавіцкіх лідэраў у Маскве Беларусь страціла большую частку сваіх этнічных тэрыторый – Віцебскую, Магілёўскую і Смаленскую губерніі. Вясной 1919г. ён уступіў у БПСР і стаў адным з яе лідэраў. На некаторы час у жніўні 1919г. ён прыняў праграму федэрацыі Беларусі з Польшчай, але хутка пераканаўшыся ў сапраўдных мэтах польскіх акупантаў ён вяртаецца на незалежніцкія пазіцыі і выказваецца за разгортванне ўсенароднай барацьбы супраць палякаў і падрыхтоўку нацыянальна-вызваленчага паўстання супраць іх.

Восенню 1919г. у Смаленску паміж беларускімі эсэрамі і бальшавікамі было падпісана пагадненне аб сумеснай барацьбе з палякамі. Гэта прывяло да расколу Рады БНР на Народную Раду, на чале з В. Ластоўскім, якая падцвердзіла незалежнасць БНР і заявіла пратэст супраць польскай акупацыі і Найвышэйшую раду БНР, урад якой узначаліў А. Луцкевіч, які выказаўся за супрацоўніцтва з акупантмі і за федэрацыю з Польшчай. 17 снежня 1919г. В. Ластоўскі і большасць членаў яго ўрада былі арыштаваныя палякамі і кінуты ў турму. Праз паўтара месяца іх вызвалілі з турмы і дазволілі выехаць у Каўнус, дзе В. Ластоўскі далучыўся да барацьбы літоўцаў супраць польскай акупацыі. В. Ластоўскі і Народная рада БНР асудзілі Рыжскі мірны дагавор і прынялі актыўны удзел у арганізацыі партызанскага руху ў Заходняй Беларусі ў 1921-1924гг. [4, с. 388].

У жніўні 1923 года В. Ластоўскі выйшаў у адстаўку з пасады Старшыні ўрада БНР. Рада пераехала ў Прагу, а В. Ластоўскі, які тады ўжо прызнаў савецкую ўладу і поспехі ў беларусізацыі, застаўся жыць у Каўнусе і ўзначаліў беларускі рух у Літве. У гэты перыяд ён актыўна займаўся навуковымі даследаваннямі, па выніках якіх былі выдадзены “Падручны

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

расійска-крыўскі(беларускі) слоўнік" (1924г.) і "Гісторыя беларускай (крыўскай) кнігі" (1926г.).

У 1927г. Вацлаў Юсцінавіч стаў грамадзянінам СССР і пераехаў у Мінск. Ён узначаліў Беларускі дзяржаўны музей, з 1929г. быў абраны сапраўдным членам АН БССР і яе неадменным сакратаром. У час першай хвалі рэпрэсій супраць нацыянальных дзеячаў, ён быў арыштаваны разам з іншымі вучонымі і пісьменнікамі быў высланы за межы БССР. Яго кнігі і навуковыя артыкулы былі забаронены і доўгі час былі невядомымі на Радзіме. У 1938г. ён быў паўторна арыштаваны і на гэты раз расстраляны як "вораг народа". Толькі ў 1988г. крымінальная справа супраць В. Ластоўскага была спынена і ён быў рэабелітаваны з-за адсутнасці складу злачынства[3, с. 185 - 186].

Такім чынам, В. Ластоўскі пражыў нядоўгае, але вельмі насычанае падзеямі жыццё, большая частка якога была прысвечана мэтанакіраванай, прынцыповай і паслядоўнай барацьбе за нацыянальнае і сацыяльнае вызваленне, стварэнне суверэннай беларускай дзяржаўнасці, нацыянальнай гісторычнай навукі і адукацыі.

Ацэньваючы значэнне працы Вацлава Ластоўскага "Кароткая гісторыя Беларусі", трэба адзначыць, тое, што падыходзіць да яе з меркамі і патрабаваннямі сённяшняга дня як да гістарычных даследаванняў так і да вучэбна-метадычных гістарычных выданняў нельга. Ствараючы гэтую кнігу, аўтар не ведаў і не мог ведаць, якіх поспехаў дасягне беларуская гістарыяграфія і методыка выкладання гісторыі, што ў іх будзе добрага, а што дрэннага. Трэба разглядаць змест кнігі такім, якім ён быў апублікаваны больш за сто гадоў таму назад.

Пры гэтым трэба мець на ўвазе, што сам Вацлаў Ластоўскі спецыяльных гістарычных даследаванняў не праводзіў і нават не атрымаў сістэматычнай гістарычнай адукацыі. Кніга носіць кампілятыўны характар і заснаваная на шырокім выкарыстанні тагачасных прац рускіх польскіх і ўкраінскіх гісторыкаў. Аб гэтым сведчыць і сам аўтар, які ў прадмове да кнігі

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

і прыведзеным у яе пачатку не багатым спісе тагачасных выданняў па гісторыі Беларусі, які абмежаваны ўсяго 18 кнігамі. З аналізу зместу кнігі бачна, што аўтар меў добрыя сувязі з беларускімі этнографамі, фальклярыстамі і пісьменнікамі, аб чым сведчаць таксама дапіскі да ілюстрацый, прыведзеных у дапаможніку.

Новым і найбольш значным ў кнізе В. Ластоўскага з'яўляецца тое, што ўпершыню ён паказаў беларускі народ не толькі як аб'ект гісторыі, залежны ад волі больш магутных суседзяў Расіі і Польшчы, але і як самастойны суб'ект гісторыі – творцу свайго ўласнага лёсу [2, с. 117]. Упершыню ён абгрунтаваў выснову, што тысячагадовая нацыянальная спадчына беларусаў хаваецца за яшчэ нерасшыфраванымі для сучаснікаў тэрмінамі "рускі" і "літоўскі", што шырокае ўжыванне гэтых тэрмінаў у дачыненні да беларусаў вельмі часта ўводзіла і ўводзіць ў зман не толькі людзей мала дасведчаных, а нават многіх гісторыкаў. Гэта тэрміналагічная заблытанасць часта выкарыстоўвалася свядома не толькі тады, але і ў беларускай гістарыяграфіі 30-х гадоў XXст., каб сказіць і прынізіць нацыянальную гісторыю беларусаў.

У працы В. Ластоўскага зроблена першая спроба даць перыядызацыю гісторыі Беларусі. Ён вылучае пяць перыядаў:1) ад старажытных часоў да ўцёку полацкіх князёў у Літву (1129г.); 2) ад звароту полацкіх князёў (1132г.) да смерці Вітаўта (1430г.): 3) ад смерці Вітаўта да Люблінскай уніі (1569г.); 4) ад Люблінскай уніі да падзелаў Рэчы Паспалітай; 5) Беларусь пад Расіяй.

Такая перыядызацыя заснаваная на агульнадзяржаўным падыходзе да гісторыі мела шырокую практыку прымянення ў другой палавіне XIX – пачатку XXст. у расійскай гістарыяграфіі, ды у многім захавалася і ў нашы дні. Заслугай В. Ластоўскага было тое, што ён упершыню прывёў правільную паслядоўнасць праўлення вялікіх князёў літоўскіх, таму што ў тагачаснай расійскай і польскай гістарыяграфіях, усе вялікія князі ад Жыгімонта Кейстутавіча значыліся як польскія каралі. Як расійскія, так і польскія

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

гісторыкі аднолькава ігнаравалі факт існавання  Вялікага княства Літоўскага і яго гаспадароў.

Галоўнае прызначэнне “Кароткай гісторыі Беларусі” гэта азнаямленне беларусаў, асабліва моладзі з багатай гісторыяй роднага краю, усведамленне ей своеасаблівасці і адметнасці гістарычнага шляху свайго народу, сваёй прыналежнасці да гэтага народу і яго права на нацыянальнае самывазначэнне. У ёй няма, ды й не магло быць шырокага і сістэматычнага паказу падзей і іх ацэнак. Мінулае Беларусі паказана галоўным чынам як гісторыя княжанняў, войнаў і палітычных падзей з дадаткам звестак па гісторыі культуры. У дапаможніку практычна адсутнічае эканамічная гісторыя і гісторыя сацыяльных адносін у беларускім грамадстве.

Не знайшлі ў дапаможніку свайго адлюстравання многія важныя для гісторыі Беларусі падзеі. Найперш, сярод такіх падзей трэба назваць паўстанне 1863г. на Беларусі і асобу Канстанціна Каліноўскага, што, верагодна, тлумачыцца адсутнасцю ў той час спецыяльных даследаванняў прысвечаных гэтай падзеі. Многія падзеі асвятляюцца скажона, бо яны перакачавалі ў дапаможнік з тэндэнцыйных даследаванняў польскіх, рускіх і украінскіх гісторыкаў. Сам жа В.Ластоўскі, як мы ўжо адзначалі, не з’яўляўся гісторыкам-даследчыкам, а толькі таленавітым інтэрпрэтатарам гісторыі, які адабраў і адаптаваў для ўспрымання моладдзю важнейшыя на яго думку факты з гісторыі Беларусі, імкнучыся пры гэтым пазбягаць навязвання чытачу ўласных ацэнак і абагульненняў.

Для ілюстрацыі асветленых у дапаможніку гістарычных падзей аўтар змяшчае ў ім сорак малюнкаў, рэпрадукцый і фатаграфій, якія каштоўныя не толькі як сродкі канкрэтызацыі гістарычных падзей, але і аўтарскімі каментарыямі, зробленымі да іх. Менавіта ў гэтых каментарыях мы адчуваем уласную пазіцыю аўтара, яго адносіны і ацэнкі да асвятляемых у дапаможніку фактаў і гістарычных асоб.

Выхад дапаможніка ў свет выклікаў хвалю рэзкіх крытычных рэцэнзій, з боку афіцыйных расійскіх гісторыкаў, а таксама рэзкіх выпадаў з боку

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

польскіх гісторыкаў. І тыя і другія крытыкавалі В. Ластоўскага за скажэнне гістарычнай праўды, фальсіфікацыю гістарычных фактаў. Галоўнае з чым яны не маглі пагадзіцца гэта існаванне беларусаў і адметнай, ўласна беларускай гісторыі. Больш за тое, і зараз многія расійскія і польскія гісторыкі застаюцца на пазіцыях вялікадзяржаўнага шавінізму ў адносінах да беларусаў і нават спрабуюць ігнараваць факт існавання ўласна беларускай гістарыяграфіі

Праца В. Ластоўскага стала першым у гісторыі станаўлення нацыянальнай адукацыі вучэбным дапаможнікам, напісаным беларусам для беларусаў. Яго выданне, а затым і выкарыстанне ў нелегальных беларускіх школах паклала пачатак станаўленню нацыянальнай гістарычнай адукацыі, паслужыла ўзорам для У. Ігнатоўскага і іншых аўтараў вучэбных дапаможнікаў па гісторыі Бацькаўшчыны[1, с. 49]. Менавіта у гэтым заключаецца гістарычнае значэнне кнігі В.Ластоўскага "Кароткая гісторыя Беларусі".

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

ЛІТАРАТУРА


1. Багдановіч, І.І. Методыка выкладання гісторыі ў школе: вучэбны дапам. / І.І. Багдановіч. – Мінск: БДПУ, 2009.
2. Ластоўскі, В.Ю. Кароткая гісторыя Беларусі / В.Ю. Ластоўскі. – Мінск: Універсітэцкае, 1992.
3. Сачанка, Б. Сняцца сны аб Беларусі / Б. Сачанка. // – Маладосць. – 1990. – № 3 – С. 162 – 186.
4. Сідарэвіч, А.М. Беларуская народная рэспубліка / А.М. Сідарэвіч // Энцыкл. гіст. Беларусі: у 6 т. – Мінск: 1993 – 2003. – Т. 1. – Мінск:БелЭн, 1993.